Прачытай сам і перадай другому.

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 15 (4575)

26 лютага 2021 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

ЛІСТ З РЭДАКЦЫІ

Падтрымайце, калі ласка…

Паважаныя чытачы!

Шаноўныя валанцёры!

«Народная Воля» перажывае надзвычай цяжкія часы. Вось ужо каторы месяц улады не здымаюць блакаду з друкарні, не дазваляюць распаўсюджваць газету праз «Белпошту» і «Белсаюздрук». Выратаванне ў адным – выхад выдання ў электронным варыянце. Але гэта не спрые вырашэнню фінансавай праблемы. Вось чаму ў чарговы раз звяртаемся да вас, сябры, з просьбай: дапамажыце! Толькі разам мы зможам уратаваць «Народную Волю».

Ёсць некалькі спосабаў пералічэння грашовых сродкаў (даём у рускамоўнай транскрыпцыі).

1.Через ЕРИП:
СМИ – буква Н – Народная Воля – Добровольные взносы.
2.Через банк:
ИЧУП «Народная Воля». 220030, г.Минск, ул.Энгельса, 34а
р/с BY08 PJCB 3012 0065 3510 0000 0933
код PJCBBY2X, ЦБУ 113 «Приорбанк» ОАО, г.Минск
УНП 100961759, ОКПО 37381505
3.Подписаться на PDF-версию газеты «Народная Воля» можно на сайте belpressa.by.

Спадзяёмся, шаноўныя прыхільнікі свабоднага слова, на ўзаемаразуменне.

Вы — з «Народнай Воляй», «Народная Воля» — з Вамі!

АКТУАЛИИ

Светлана КАЛИНКИНА

Утопят…

Белорусская госпропаганда так безмозгло «топит» за Александра Лукашенко, что и на самом деле его утопит.

Недавно провластный блогер Алексей Голиков на СТВ хвалил нацистские порядки. Рассказывал, что, когда безбилетников из поезда выводили и расстреливали, а на обоих концах поля ставили виселицы для тех, кто ворует помидоры, – это порядок, это правильно. *«Власть нельзя держать растопыренными пальцами»,* – вещал Голиков в эфире государственного телеканала, проводя прямые параллели с подавлением протестов в Беларуси и методами, которыми устанавливался порядок в нацистской Германии. По его мнению, именно так и надо. *«Мы создадим свою Германию с ее стандартами»,* – пообещал он.

Первая линия атаки госпропаганды – это атака на протестующих и оправдание насилия силовиков. Вторая линия – Виктор Бабарико, экс-глава «Белгазпромбанка», которому не позволили участвовать в президентской кампании, но который, согласно независимым социологическим опросам, намного опережает в рейтингах популярности Александра Лукашенко. «Уголовщина»», «банкир в законе», «ворюга» – еще до решения суда пропагандисты просто соревнуются в навешивании ярлыков на Бабарико, стремясь угодить главному телезрителю, заказчику и основному потребителю продукции отечественного агитпропа.

Они думают, что топят Бабарико и реабилитируют Лукашенко. Неучи от «черного пиара»! Классику читать нужно. Например, Иосифа Бродского, который метко подметил: *«Но ворюга мне милей, чем кровопийца».*

И мне милей. И любому нормальному человеку милей. Перефразируя: «Но народу вор милей, чем кровопийца». Именно поэтому в общественном сознании Виктор Бабарико обязательно будет выигрывать у Александра Лукашенко, какие бы ярлыки на него ни навешивали. И это даже если не вдаваться в подробности того, как и когда Бабарико оказался за решеткой. И почему, громогласно провозглашая «Детей не трогайте!», Лукашенко упек в СИЗО не только своего политического соперника, но и его сына. Ну а уж если вдаваться в детали, то выяснится, что Бабарико вовсе и не вор. А, наоборот, человек, сделавший для Беларуси много хорошего.

Но перейдем к третьей линии пропагандистской атаки – Лукашенко не президент ОМОНа, у него есть сторонники.

И правда есть. Никто не спорит. Но лучше бы их не показывали.

Гомельский комиссар-ябатька **Андрей Кривоносов** на Всебелорусском народном собрании пожал руку Александру Лукашенко и поехал на родину энергию рукопожатия передавать всем остальным. По этому поводу два сюжета выпустили: запечатленной на видео эстафеты рукопожатий среди военных показалось мало, так Кривоносов со своей немытой рукой, на которой остается президентский «заряд энергии и решительности», еще и к гомельским милиционерам пошел.

Это треш. Это что-то между сектой, Северной Кореей и сумасшедшим домом. Это полный неадекват. Это такая дискредитация сторонников Лукашенко и силовиков, какой мы раньше не видели. И абсолютно точно это наглядный пример известной народной мудрости о том, что услужливый дурак опаснее врага.

Намного опаснее! Потому что под видом госпропаганды и наведения порядка полным ходом идет целенаправленная работа по отвращению людей от власти. И за этим можно было бы просто наблюдать, потому что никто не сможет навредить нынешней белорусской власти больше, чем она сама вредит себе, если бы не одно «но».

Укрепляя образ президента-кровопийцы, они убивают и калечат людей, пытают в тюрьмах, ломают судьбы, мучают семьи, при живых родителях отправляют детей в приюты. Они делают то, что невозможно простить, и на многие годы вперед закладывают под белорусское общество бомбу вражды.

Какой заряд энергии передавал своей эстафетой рукопожатий комиссар-весельчак Кривоносов? Еще более энергично и решительно давить свой народ?

К чему призывает блогер Голиков? Готовить виселицы?

На что рассчитывает Александр Лукашенко, в глазах всего мира превращаясь из Батьки в упыря и кровопийцу?.. С такими методами – уж точно не на спокойную старость в родной стране.

«Мы, оглядываясь, видим лишь руины», – писал все тот же Иосиф Бродский. Именно так и будет. Если они не остановятся, если их не остановить, то от Лукашенко, от мифа о народном президенте, от веры белорусов в закон и порядок, от Беларуси они оставят лишь руины. Утопят…

У СУСЕДЗЯЎ

Сярэдні заробак у Польшчы дасягнуў амаль 1500 доляраў

Сярэдні заробак у Польшчы ўзрос да 5537 злотых (блізу 1236 еўра). Гэта на 254 злотыя (амаль 57 еўра) больш, чым годам раней, паведамляе «Радыё Польшча».

Варта адзначыць, што ў Польшчы як краіне з малой доляй дзяржаўнага сектара ў эканоміцы і з прыватнымі сялянскімі гаспадаркамі, акрамя заробку людзі маюць яшчэ і даходы ад бізнесу і ўласнасці, таму рэальны разрыў паміж даходамі людзей у Польшчы і Беларусі яшчэ большы.

Трэба заўважыць, што на пачатку 1990-х Польшча і Беларусь знаходзіліся прыкладна на аднолькавым узроўні развіцця.

НЕСТЫКОВКА

Мировая оценка

Беларусь потеряла 98 позиций в рейтинге безопасности по шкале международной базы Numbeo. На начало 2020 года она занимала 16-е место из 129 стран и находилась между Хорватией и Данией. За период репрессий со стороны властей Беларусь оказалась на 114-м месте и фигурирует между Доминиканской Республикой и Кенией.

Заявление Владимира МАКЕЯ

– Мы с гордостью можем заявить, что белорусские города – одни из самых безопасных городов в мире, что всем гражданам в нашей стране обеспечена возможность трудовой занятости, предоставлено право на пенсию, бесплатное образование и одну из самых доступных и эффективных в мире систем бесплатной медицины.

БЛИЦ-КОММЕНТАРИЙ

Ваше мнение, читатели?

Так, порассуждайте, уважаемые друзья, над информацией, проливающей свет на рейтинг Беларуси в мировом масштабе, а также над тем, что сказал на днях министр иностранных дел нашей страны Владимир Макей. Что, и в самом деле «белорусские города – одни из самых безопасных городов в мире»? Что, у нас десятки тысяч человек не прошли через милицейские участки, следственные изоляторы и суды за последние месяцы? Что, мало людей осталось без работы из-за активной гражданской позиции? А сколько у нас молодых людей получают бесплатное высшее образование и сколько вынуждены вкладывать немалые деньги? Можно ли говорить о бесплатной медицине, если для поддержания здоровья гражданам приходится всё больше и больше платить…

Словом, дорогие друзья, есть над чем задуматься!

ГУЧНАЯ СПРАВА

Працэс працягнецца 2 сакавіка

Учора ў судзе Маскоўскага раёна Мінска працягнуўся разгляд справы журналісткі TUT.BY Кацярыны Барысевіч і доктара Бальніцы хуткай дапамогі Арцёма Сарокіна.

Крымінальную справу ў дачыненні да Кацярыны Барысевіч і Арцёма Сарокіна распачалі 19 лістапада 2020 года. Іх абвінавачваюць ў разгалошванні медыцынскай таямніцы, што, на думку Генпракуратуры, пацягнула цяжкія наступствы.

13 лістапада пад аўтарствам Кацярыны Барысевіч выйшаў артыкул, у якім са спасылкай на медыцынскія дакументы і каментарый доктара сцвярджалася, што ў крыві Рамана Бандарэнкі не было выяўлена этанолу. Хоць А.Лукашэнка публічна заявіў, што памерлы хлопец быў п'яны.

Як вядома, суд праходзіць у закрытым рэжыме. Працэс працягнецца 2 сакавіка ў 10.30. Магчыма, ужо на наступным тыдні будзе вынесена рашэнне па гэтай гучнай справе.

Віктар ШПАК.

ЭКСПРЭС-КАМЕНТАРЫЙ

Валерый КАРБАЛЕВІЧ

Армянскія паралелі

Чаму ў Арменіі войска (у выглядзе Генштаба) падтрымала народныя пратэсты і запатрабавала адстаўкі Нікола Пашыняна, а ў Беларусі войска, як паказаў судовы працэс у Брэсце, актыўна ўдзельнічала ў падаўленні народных пратэстаў?

Прычын шмат. Абазначу толькі некалькі.

Арменія ўжо 30 гадоў знаходзіцца ў стане вайны. Таму войска аб'ектыўна мае значную палітычную вагу.

Да таго ж Арменія напрыканцы мінулага года пацярпела цяжкую ваенную паразу ў вайне з Азербайджанам. Што мела сваімі наступствамі глыбокую нацыянальную траўму. І хтосьці за гэта павінен адказаць.

У Арменіі палітычная сістэма адносна дэмакратычная. Краіна перажыла ў 2018 годзе пераможную "каляровую рэвалюцыю", якая лішні раз паказала, што народ – суб'ект палітыкі.

Нічога гэтага ў Беларусі няма. Дзякаваць Богу, краіна жыве без вайны. Тут усе дзяржаўныя інстытуты – усяго толькі інструменты у руках Лукашэнкі. Ніякай самастойнай ролі яны не маюць. Яны – вінцікі сістэмы. А вінцікі не могуць быць самастойным суб'ектам.

ЧУЛІ?

Васіль Завадскі з'ехаў у Вільнюс

"Канфіскаваны ўсе ноўтбукі, жорсткія дыскі са стацыянарных камп'ютараў, – каментаваў днямі старшыня незалежнага прафсаюза РЭП **Васіль Завадскі** нядаўнія вобыскі ў офісе прафсаюза. – *Людзей, якія праводзіліператрус, вельмі зацікавіла невялікая сума грошай, знойдзеная ў сейфе. Пачалі задаваць пытанні, але гэта былі мае асабістыя грошы".* Таксама падчас вобыску ў офісе РЭП знайшлі патрон.

У "Фэйсбуку" Васіль Завадскі распавёў пра некаторыя падзеі, якія папярэднічалі ягонаму ад'езду: *"На мінулым тыдні прыехаў на пошту атрымаць бандэроль. А мне кажуць: "Тут на ваша імя перавод вярнуўся". Аказваецца, гаворка ішла аб пераводзе, які я дасылаў* ***Мікалаю Аўтуховічу*** *яшчэ 10 снежня, але ён яго не атрымаў, яму далі распісацца аб вяртанні. Я кажу: "Дык я зараз адпраўлю яго зноў Аўтуховічу". Жанчына, якая працуе на пошце, натуральна, нічога супраць не мае. Пачынае ўводзіць звесткі, пытаецца пра мае пашпартныя дадзеныя і здзіўляецца: пішуць, што Аўтуховіч – тэрарыст і пераводы яму не прымаюцца. "Ой, тут напісана, што вы – асоба, якая знаходзіцца пад кантролем!" А я і сам бачу, што на яе маніторы пачаў міргаць чырвоны знак STOP. На пошце!"*

"Магу сказаць, што выбар быў складаны, – распавёў Завадскі пра свой ад'езд. – *Аднак пераважыла простая логіка: знаходзячыся тут, у Вільнюсе, я змагу працягваць дапамагаць іншым. Знаходжанне ў камеры СІЗА запатрабавала б дапамогі мне.*

Усе падрабязнасці пакуль раскрываць не магу, скажу толькі, што ўдзячны Богу за надзейных сяброў і добрых людзей!"

Галіна РУТ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
26 ЛЮТАГА 2021 г.

НА ШПАГАХ

Давать характеристики Федерации профсоюзов Беларуси, как и ее руководителю М.Орде, нет смысла. Все знают: так называемые провластные профсоюзы не столько защищают права трудящихся, сколько служат действующему режиму. Об этом свидетельствует и тот факт, что в прошлом году на президентских выборах главным доверенным лицом А.Лукашенко был тот же Михаил Орда. Немалый резонанс вызвало и его выступление на недавнем Всебелорусском народном собрании (хотя по-настоящему народным это мероприятие нельзя назвать).

«Народная Воля» попросила прокомментировать бесславную речь Орды председателя Конфедерации демократических профсоюзов Александра Ярошука. Читайте и сравнивайте слова одного и другого.

Благими пожеланиями дорога в ад мостится

Михаил Орда:

– Сохранение рабочих мест и заработная плата – основные и главные темы для профсоюзов. Поэтому в первую очередь в своем выступлении я хочу заявить о том, что под громкие лозунги и популистские обещания, а по своей сути – провокаторскими действиями белорусов хотят лишить стабильной работы и стабильной зарплаты.

Именно на это направлены экономические санкции Евросоюза против белорусских предприятий.

Самое парадоксальное, что западные политики громко говорят о правах людей и при этом сами грубейшим образом нарушают права граждан нашей страны. В резолюциях Организации Объединенных Наций не раз было подчеркнуто, что санкции – это ограничение права на труд. И что ни одна страна мира или группа стран не имеют права применять экономические или политические ограничительные меры с целью добиться подчинения себе другого государства.

Но именно это делают сегодня европейские чиновники. По сути, это узурпация международного права. То есть фактически мы видим, что происходит подрыв и демонтаж основополагающих правил мирового порядка, которые вырабатывались десятилетиями.

И мы понимаем, что вот так – абсолютно без каких-либо оснований – санкции могут быть введены в отношении любых предприятий.

Александр Ярошук:

– Если послушать Орду, то может сложиться впечатление, что ЕС ввел санкции против всей экономики нашей страны, что они затрагивают интересы всех предприятий и всех работников. На самом деле это взвешенные меры, введенные против отдельных предприятий («Амкодор», МЗКТ, Главное хозяйственное управление Управления делами президента).

Эти предприятия относены к так называемым кошелькам режима. С точки зрения ЕС, они несут ответственность за финансирование аппарата насилия, осуществляющего жестокие расправы над белорусским народом. Эти меры вообще нельзя назвать экономическими санкциями. ЕС пока ограничился тем, что послал четкий сигнал руководителям отдельных предприятий – прекращайте финансировать аппарат насилия и направляйте эти средства на нужды собственных предприятий, в том числе и на повышение заработных плат своих работников.

Руководителю ФПБ следовало обвинять не ЕС в бедах белорусских рабочих, а адресовать властям эти вопросы. Почему вот уже 10 лет не растут в стране зарплаты? Почему всё острее становятся проблемы занятости, больше работников увольняется, чем принимается на работу? Почему всё больше наших соотечественников вынуждены в поисках работы уезжать в качестве трудовых мигрантов в другие страны? Нигде, ни разу за последние 18 лет руководство ФПБ даже не попыталось предъявить претензии власти, повинной в том, что белорусы лишаются и стабильной работы, и достойной зарплаты.

Михаил Орда:

– И при этом из-за рубежа нам цинично говорят о том, что якобы санкции введены по требованию самих работников.

Мы видим, что это абсолютная и откровенная ложь.

Более миллиона человек за совсем короткий промежуток времени подписались под открытым письмом против действий и санкций Европейского Союза. Люди возмущены тем, что чиновники Евросоюза фактически объявили экономическую войну простым белорусам.

Александр Ярошук:

– Вероятно, ответ Михаилу Орде дали рабочие ОАО «Гродно Азот». Менее 500 членов независимого профсоюза предприятия без всякого давления на работников собрали 1350 подписей против так называемого Всебелорусского народного собрания. В то время как более 5 тысяч членов провластного профсоюза ФПБ под давлением на работников собрали всего 165 подписей против санкций ЕС. Это всё, что белорусам надо знать об отношении рабочих и к ВНС, и к санкциям ЕС.

Рабочие понимают, чем вызваны и против кого направлены на самом деле санкции Европейского Союза. А что касается более миллиона собранных ФПБ подписей, то мы знаем, какие там мастера их рисовать. На прошлогодних президентских выборах провластные профсоюзы устами Михаила Орды объявили о собранных 2 миллионах подписей, хотя все знают, как они собирались и насколько эта цифра соответствует действительности.

Михаил Орда:

– Мы уже направили открытое письмо и собранные подписи в Совет Европейского Союза. И Евросоюз не имеет права отмахнуться от мнения людей.

Мы будем добиваться, чтобы незаконные решения Евросоюза были отменены. И в целом будем поднимать на международных площадках вопрос о том, что никто в мире не имеет права принимать подобные необоснованные дискриминационные меры. И тем самым лишать людей рабочего места и заработка.

Александр Ярошук:

– ФПБ затеяла авантюру, которая может вылезти ей и властям боком. Миллион с лишним сфальсифицированных, полученных под принуждением подписей работников убедят международное сообщество только в том, насколько катастрофической стала ситуация с правами трудящихся в Беларуси.

Дело может прийти к тому, что МОТ, которая 20 лет считает Беларусь одной из самых проблемных в мире стран, будет вынуждена ужесточать свою политику в отношении правящего режима. Сейчас мы совместно с Международной конфедерацией профсоюзов (я являюсь вице-президентом МКП) готовим жалобу в МОТ. Не вдаваясь в детали последствий ее рассмотрения, как член Административного совета МОТ скажу, что МОТ может принять самые радикальные решения, предусмотренные ее уставом. Беспрецедентность насилия, в том числе в отношении работников, увольнения, судебные расправы над бастующими рабочими дают на это все основания.

Михаил Орда:

– Остановлюсь также на важных вопросах внутренней повестки, которые поднимались трудовыми коллективами при подготовке к Всебелорусскому народному собранию.

Пути решения многих проблемных вопросов, которые сегодня волнуют людей, обозначены в проекте Программы социально-экономического развития Республики Беларусь на 2021–2025 годы. При этом в программе отражены интересы всех категорий людей и всех отраслей экономики.

Вместе с тем есть вопросы, которые считаю необходимым обсудить.

Эффективная и стабильная занятость людей.

Сегодня абсолютное большинство нанимателей используют контрактную форму найма.

Мы считаем, что надо шире применять бессрочные трудовые договоры. В первую очередь для добросовестных работников. Для человека это будет хорошей мотивацией и дополнительным стимулом в работе. Даст уверенность в завтрашнем дне. И, что немаловажно, будет способствовать укреплению трудовых коллективов. Поэтому мы предлагаем четко прописать в законодательстве, в каких случаях наниматель обязан будет заключать с работником именно бессрочный трудовой договор.

Александр Ярошук:

– Не прошло и 20 лет, как до носителей идеологии бесправия трудящихся в лице руководства ФПБ дошло, что бессрочный трудовой договор лучше срочного. Переводя трудящихся на временные условия найма, власть целенаправленно лишала работников мотивации и стимулов к работе, уверенности в завтрашнем дне, превращала их, по сути, в крепостных, в рабов. И помогала власти надеть на рабочих рабские оковы срочных трудовых контрактов ФПБ.

Превращение Беларуси в страну временной занятости привело к губительным последствиям и для трудящихся, и для экономики в целом. Это стало драмой для целого поколения трудящихся, тормозом в развитии экономики, одной из причин низкой ее эффективности. Поэтому нужно безотлагательно переводить не избранных, как предлагает Михаил Орда, а всех работников на бессрочные договоры. В Беларуси не должно быть места рабству и крепостничеству.

Михаил Орда:

– При формировании пенсии должны учитываться результаты труда человека.

Президент в своем вступлении поднимал эту тему. И мы в целом согласны с озвученными подходами.

Но в этом вопросе есть еще несколько принципиальных моментов, которые требуют своего решения.

В первую очередь это касается подходов по определению величины пенсии. Действующая система не в полной мере учитывает результаты и эффективность труда человека.

Приведу пример. Есть два работника завода. Один всю жизнь учится, повышает свою квалификацию, разряд. Работает от темна до темна. А второй, как говорят, особо не напрягается: и образования нет, и работа непыльная. А разница в пенсии у них – 100–150 рублей. Хотя заработная плата, пенсионные отчисления и, соответственно, накопления у них отличаются в несколько раз.

Или еще один момент. По достижении пенсионного возраста человек продолжает трудиться. Соответственно, отчисляет и накапливает пенсионные взносы. Но пенсию ему не перерассчитывают. Люди обращаются и говорят, что это несправедливо!

Мы уже направили правительству свои предложения по совершенствованию пенсионной системы. И считаем, что эту тему нельзя откладывать в долгий ящик. Ее надо детально обсудить, выслушать мнения людей и принимать решения, направленные на установление более справедливых подходов.

Александр Ярошук:

– Суть предложений Орды сводится к тому, чтобы усовершенствовать нынешнюю пенсионную систему, сделать ее более справедливой. Но ее невозможно ни усовершенствовать, ни сделать более справедливой. К тому же в критическом положении находится ФСЗН, на рост пенсий средств в фонде нет. Стране безотлагательно необходимо осуществлять пенсионную реформу. Надо вводить в действие помимо солидарной накопительную систему формирования пенсий. Это позволит уйти от уравнительности пенсионного обеспечения и повысит мотивацию работника заработать себе достойную пенсию.

Но пенсионную реформу невозможно провести в отрыве от реформирования экономики в целом, обеспечения ее эффективности и конкурентоспособности. Беларусь столкнулась с системным кризисом, и выйти из него возможно только путем системных реформ всех сфер жизнедеятельности государства. Чего правящий режим и примкнувший к нему Михаил Орда признавать не желают.

Михаил Орда:

– Ведомства должны системно работать на упреждение роста цен.

Еще один важный вопрос – ценообразование. Эта тема находится под постоянным вниманием профсоюзов. В прошлом году мы инициировали введение мер по регулированию цен на социально значимые товары. Это дало свой эффект по ограничению роста цен.

Вместе с тем сегодня есть и отдельные проблемные моменты.

Прежде всего, это стоимость лекарств. Наш мониторинг показал, что только за январь цены на многие лекарства выросли. Пять, десять процентов и выше.

Да, где-то есть и объективные причины: повышение закупочных цен, налога на добавленную стоимость. Но давайте говорить прямо: есть и спекулятивный фактор.

Сейчас очень модно прикрывать рост цен, как говорят сами поставщики и продавцы, ожиданием каких-то рисков, возможных убытков. Как это определяется и высчитывается – абсолютно не понятно. И, самое главное, кто вернет людям деньги, если так называемые риски не подтвердятся? Мы понимаем, что крайними в таких случаях останутся, как правило, люди.

В связи с этим, предлагаем ввести дополнительное ограничение на рост цен на наиболее востребованные лекарства. По крайней мере в период роста вирусных заболеваний. Это необходимо сделать, чтобы не было различного рода спекуляций на повышенном спросе.

В целом в вопросе цен хочу отметить следующее. Лекарства, коммуналка, продукты – за все это человек платит из одного кошелька. Поэтому все ведомства должны системно работать на упреждение роста цен. А не бить, как говорят в народе, по хвостам, когда они уже выросли. И, самое главное, все решения в этом вопросе должны приниматься с учетом динамики реальных доходов людей. Поскольку уровень цен во многом определяет и уровень жизни наших граждан.

Александр Ярошук:

– Конечно, председатель ФПБ не мог не упомянуть об одном из главных своих занятий – о регулировании цен. Правда, цены его слушаться не хотят, чем больше он с ними борется, тем быстрее они подрастают. Но, похоже, Орда свято верит в действенность административного контроля над ценами и не намерен сдаваться.

Что означает одно – цены в стране будут ползти вверх. Ибо причина их роста не в отсутствии административного контроля, а в неэффективной, убыточной экономике. Она и генерирует рост цен на товары, в том числе на продукты питания. Но на упоминание об истинной причине их роста наложено табу, и Михаилу Орде ничего не остается, как вслед за властью повторять мантры, что ценам можно приказать стоять на месте.

Михаил Орда:

– В истории нашего государства было немало сложных периодов. Но все вопросы и все проблемы мы всегда решали только вместе и сообща. Так было во время войн, которых было немало в нашей истории, во время становления нашего государства. И сегодня те вопросы и угрозы, которые ставит перед нами жизнь, мы сможем преодолеть только в том случае, если будем едины. Мы все живем в одной стране. Мы все – это наша Беларусь. И никому нельзя дать возможности нас разобщить и разъединить.

Александр Ярошук:

– Интересно было бы узнать, что стоит за призывом Михаила Орды быть едиными. Кто с кем должен объединяться – репрессирующие с репрессированными, насильники с жертвами насилия?

Нет иного пути к объединению белорусов, кроме как прекращать жестокое насилие над народом, проявить власти ответственность и начать с его представителями диалог о поиске путей выхода из острого политического кризиса. Иначе все призывы Орды и ему подобных мудрецов к единству белорусского народа останутся благими пожеланиями. А ими, как известно, сегодня для белорусов дорога в ад мостится…

ГУЧНАЯ СПРАВА

Як праходзіць расследаванне па «справе Баскава»?

Міжнародная федэрацыя хакея раскрыла некаторыя дэталі, якія тычацца старшыні Федэрацыі хакея Беларусі.

Як вядома, напрыканцы мінулага тыдня Генпракуратура паведаміла **Алене Бандарэнка**, маці **Рамана Бандарэнкі**, што заведзена крымінальная справа па факце наўмыснага прычынення цяжкага цялеснага пашкоджання, што пацягнула па неасцярожнасці смерць яе сына.

Гаворка ідзе пра ч.3 арт.147 Крымінальнага кодэкса Беларусі. За гэта злачынства прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення волі на тэрмін ад 5 да 15 гадоў.

Нагадаем, што 11 лістапада мінулага года ў Мінску на так званай Плошчы Перамен невядомыя напалі на мясцовага жыхара Рамана Бандарэнку, які абараняў бел-чырвона-белыя стужкі, збілі яго, схапілі і звезлі на мікрааўтобусе. У выніку хлопец, якога затым з РУУС адвезлі ў бальніцу, памёр.

Пазней у СМІ былі апублікаваны матэрыялы, у якіх журналісты і людзі, якія ведаюць **Дзмітрыя Шакуту**, прыйшлі да высновы, што чалавек у чорнай камізэльцы і шэрай кофце, які напаў на Бандарэнку, вельмі падобны на шматразовага чэмпіёна свету па тайскім боксе і кікбоксінгу.

Таксама на відэа быў зафіксаваны чалавек, вельмі падобны на кіраўніка Беларускай федэрацыі хакея **Дзмітрыя Баскава.**

Мы паведамлялі, што Дзмітрый Шакута, пасля таго як з'явілася гэтае відэа, на нейкі час пакінуў Беларусь, але затым вярнуўся ў Мінск. Дзмітрый Баскаў нікуды не з'язджаў, заявіўшы, што яго *"безгрунтоўна абвінавачваюць"* у тым, да чаго ён *"не маю ніякага дачынення"*. Мяркуем, нагодай для такіх абвінавачванняў паслужыла выключна яго асабістая грамадзянская пазіцыя.

Тым часам Міжнародная федэрацыя хакея пачала адмысловае расследаванне па "справе Баскава", і зараз сталі вядомы некаторыя яго дэталі.

Адказваючы на запыт журналістаў, у Міжнароднай федэрацыі хакея адзначылі, што пакуль не могуць назваць дакладныя тэрміны завяршэння расследавання, і дадалі, што чакаюць інфармацыі ад генеральнага пракурора Беларусі па справе аб гібелі Рамана Бандарэнкі на "Плошчы Перамен" у Мінску.

На пытанне, чаму Баскаў не быў адхілены да вынікаў расследавання, Міжнародная федэрацыя хакея адказала, што яе кодэкс паводзін патрабуе часовага адхілення толькі ў тым выпадку, калі ёсць падазрэнне, што чалавек удзельнічаў у дамоўных матчах.

Сяргей ЗАБЛОЦКІ.

ПАЗІЦЫЯ

Мікалай КАЗЛОЎ:
«Навошта ў такім выпадку судзейскую мантыю апранаць?..»

«Народная Воля» задала некалькі пытанняў старшыні Аб'яднанай грамадзянскай партыі, якога суд адправіў на 15 сутак за краты за тое, што ён не пагадзіўся на прапанову следчага даць падпіску аб неразгалошванні.

– Мікалай, вы будзеце абскарджваць прысуд?

– Канешне! А вось ці прыслухаецца суд да маіх слоў – гэта ўжо залежыць ад адэкватнасці суддзі.

Дарэчы, на пачатку судовага пасяджэння, калі ў мяне запыталіся пра адвод суду, я сказаў: калі суд прыняў да вытворчасці падобны пратакол, я сумняваюся ў ягонай кваліфікацыі.

Так атрымалася, што я стаў першым чалавекам у Беларусі, які атрымаў 15 сутак арышту з-за таго, што рэалізаваў сваё законнае права і адмовіўся даць падпіску аб неразгалошванні. Нягледзячы ні на што, я па-ранейшаму лічу, што зрабіў правільна і меў на гэта законнае права. А наконт таго, ці пачуе мяне суд… Права ў нашай краіне растаптана, гэтага ніхто нават ужо і не хавае.

Мне падалося, што суддзя не вельмі спрабаваў разабрацца ў справе, многія мае пытанні адхіляліся. А я хацеў пачуць канкрэтны адказ ад следчага, што мяне абавязвае даваць гэту падпіску і дзе напісана пра адказнасць, калі я адмаўляюся яе даваць. Бо тое, што яны хочуць, не заўсёды адпавядае нормам заканадаўства. Лічу, што гэта проста нейкія іх крыўды, якія незразумела на чым грунтуюцца. Суддзя, між іншым, і сам не адказаў на маё пытанне, і следчаму не даў гэта зрабіць. Таму я зрабіў выснову: ну проста хочацца некаму мяне пасадзіць! Я толькі не разумею, навошта ў такім выпадку судзейскую мантыю апранаць…

– У некаторых тэлеграм-каналах пішуць, што гэта не апошнія 15 сутак, якія вам свецяць. І паколькі вас тройчы выклікалі ў якасці сведкі ў Следчы камітэт і вы тройчы адмаўляліся даць падпіску аб неразгалошванні, то і адказваць прыйдзецца суткамі за кожны выпадак. Такім чынам быццам бы анансавана, што праз 15 сутак вы на волі не апынецеся. Маральна вы ўжо падрыхтаваліся да таго, што, верагодна, больш за месяц прыйдзецца правесці за кратамі?

– Каменціраваць гэтае трызненне даволі складана.

У маім жыцці было некалькі эпізодаў, калі мяне затрымлівалі на вуліцы быццам бы за тое, што я лаяўся матам і не рэагаваў на заўвагі супрацоўнікаў міліцыі. Таму накідаць мне яшчэ сутак – для іх гэта вельмі проста. Мяне ўжо некалькі разоў агаворвалі, пазбаўлялі свабоды. І сёння такіх, як я, тысячы!

Але я ўсё роўна лічу, што гэта маё права – даваць альбо не даваць падпіску аб неразгалошванні. І ў цяперашняй сітуацыі адмова ад яе – гэта форма абароны. Бо гэтай падпіскай яны хочуць схаваць усе свае подласці, вось у чым справа. Я і ў пратаколе допыту напісаў: крымінальная справа палітычна матывавана, невінаватых людзей кінулі за краты, і я пратэстую супраць гэтага.

Між іншым, я запытаўся ў юрыстаў, ці былі падобныя прэцэдэнты, каб каралі суткамі за тое, што чалавек адмовіўся даваць падпіску аб неразгалошванні. Не было!

– Вас не затрымалі адразу пасля суда. Магчыма, нехта чакае, што вы тэрмінова набудзеце квіткі на самалёцік?

– У мяне няма жадання з'язджаць. І я нікуды не збіраюся.

– Вы – кіраўнік партыі, а ў партыі заўсёды больш магчымасцяў, каб прыцягнуць увагу да нейкіх падзей. Напрыклад, тыя ж пікеты. Можа, варта было б накіраваць просьбу на серыю пікетаў у падтрымку тых, каго кідаюць на суткі па штучна створаных нагодах? Вось як вас партыя будзе бараніць?

– Магчыма, і можна рабіць такія пікеты. Але тут мы сутыкаемся з цяжкім маральным выбарам. У нас жа не проста заяўляеш пікет і робіш. Ты павінен заключыць дамову з медыкамі, з міліцыяй і іншымі службамі. І вы разумееце: пасля таго, што рабіла міліцыя ў мінулым годзе і робіць зараз, мне цяжка ўявіць, як з імі можна заключаць нейкія дамовы, плаціць ім. Я не гатовы да дамоў з імі! Ну і мы ж ведаем, колькі ўжо было адмоў на падобныя афіцыйныя заявы наконт пікетаў.

– Дык а партыя збіраецца прадпрымаць нейкія дзеянні ў вашу абарону?

– Я пакуль абскарджваю рашэнне суда. А там паглядзім.

Мне падаецца, што ні ў якім разе не трэба прызвычайвацца да сутак, арыштаў, штрафаў. На мой погляд, кожны такі выпадак павінен выклікаць абурэнне і пратэстную рэакцыю. Зразумела, што пратэсты могуць быць рознымі – улічваючы маштабы рэпрэсій, мы не можам кожны дзень выходзіць на вуліцу з акцыямі. Але нават у глыбіні душы мы не павінны мірыцца з дыктатурай і рэпрэсіямі. Мы павінны кранаць гэтую тэму ў размовах з сябрамі, з выпадковымі знаёмымі…

Салідарнасць, паслядоўнасць і самае галоўнае – не сумаваць, не апускаць рукі.

Тых, хто падтрымлівае рэжым Лукашэнкі, значна менш, гэта відавочна. Але яны ўзброены і гатовы праліць кроў. Але нас, мірных, больш, і будучыня за намі. А яны – ужо мінулае, якое сінімі нямоглымі пальцамі чапляецца за сваю пасаду, хтосьці за карыта. Але яны – мінулае. Чым раней гэта зразумеюць, тым лепш.

Марына КОКТЫШ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Анатоль БОКУН:
«З'язджаць за мяжу няма жадання…»

Лідар страйкама ААТ «Беларуськалій» распавёў «Народнай Волі» пра сітуацыю на прадпрыемстве, лёс людзей, якія вырашылі далучыцца да страйку, і сваё нежаданне з'язджаць з Беларусі.

Днямі на старонцы страйкама "Беларуськалія" ў "Фэйсбуку" з'явіўся запіс: *"Прайшло роўна 6 месяцаў, як неабыякавыя і годныя людзі, работнікі "Беларуськалія", абвясцілі пра тое, што больш не збіраюцца карміць гэты рэжым...*

У жнівеньскія дні больш за 6000 чалавек адмовілася ад працы, але, на жаль, мы бачылі, як з кожным днём нас станавілася ўсё менш і менш. Нашы таварышы праз пагрозы, шантаж і ўгаворы тых, хто займае кіруючыя пасады на нашым прадпрыемстве, ішлі назад на свае працоўныя месцы і працягнулі працаваць. Тым не менш мы не страцілі надзею і веру ў заўтрашні дзень…"

– Анатоль, колькі сёння чалавек у страйкаме? І ўвогуле, што сёння сабой уяўляе страйкам ААТ "Беларуськалій"?

– Калі казаць пра страйкам, то гэта, безумоўна, не арганізацыя і не нейкая структура. Гэта, скажам так, група людзей з прадпрыемства, аб'яднаных аднымі поглядамі і адной пазіцыяй. Што датычыцца нейкіх больш падрабязных дэталяў пра страйкам, то трэба разумець, што зараз мы не можам усю інфармацыю рабіць публічнай. Час такі.

– Ці можа страйкам нейкім чынам уплываць на сітуацыю на прадпрыемстве?

– Напрамую – не можа, ускосным чынам – так. У сувязі з няпростай эканамічнай сітуацыяй прадпрыемству давялося рабіць карэкціроўку планаў, якія апошнім часам не выконваліся ў поўным аб'ёме. Карэкціроўка адбывалася ў бок памяншэння.

Нягледзячы на гэта, увесь мінулы год работнікі атрымлівалі прэмію па выніках гаспадарчай дзейнасці, а напрыканцы мінулага года ім яшчэ і паднялі заробкі. Хаця павышэнне заробкаў можна назваць адносным, бо ў доларавым эквіваленце людзі нават згубілі.

Але кіраўніцтва "Беларуськалія", як бачым, вырашыла выдаткоўваць дадатковыя сродкі, каб даць рабочым пернік – не дапусціць росту незадаволенасці сярод людзей і далучэння іх да страйкамаўскага руху.

– Колькі работнікаў "Беларуськалія" далучыліся да страйку?



– На сённяшні дзень – 130 чалавек.

– Вы не працуеце на прадпрыемстве. Якім чынам падтрымліваеце сувязь з рабочымі і ці існуе яна наогул?

– Натуральна, што камунікацыі ёсць з тымі, хто першапачаткова падтрымаў страйк, але застаўся працаваць на камбінаце.

– Якія перспектывы вы бачыце ў рабоце страйкама? Вашы мэты, задачы? Бо сёння, па сутнасці, вы самі прызналі, што рэальна страйкам не мае ніякага ўплыву…

– У сённяшняй сітуацыі проста немагчыма будаваць нейкія доўгатэрміновыя планы і, як ужо казаў раней, мы не можам агучваць свае планы.

– Ці працуюць сёння на "Беларуськаліі" незалежныя прафсаюзы?

– Калі пачытаць шыльду, то як быццам Незалежны прафсаюз гарнякоў ёсць, і ён працуе. Але наўрад ці ў нашых рэаліях такі прафсаюз на прадпрыемстве можна назваць сапраўды эфектыўным сродкам абароны правоў працоўных. Трэба разумець, што ва ўмовах, калі законы не працуюць, незалежны прафсаюз не можа абараніць работнікаў. Гэта паказала практыка разгляду працоўных спрэчак і судоў пасля іх.

Не хачу ні ў каго кідаць камень, але, на мой погляд, сёння на "Беларуськаліі" ў плане дапамогі рабочым паміж незалежным і афіцыйным прафсаюзамі можна паставіць знак роўнасці. Ні тыя, ні тыя рэальна не могуць абараніць работнікаў.

– Пасля выбараў не толькі ў Мінску, але і ў іншых гарадах Беларусі кожную нядзелю праходзілі маршы і акцыі. Чаму шахцёры іх не падтрымлівалі?

– Відаць, баяліся рэпрэсій. Гэта галоўнае, што стрымлівае. У душы, магчыма, чалавек цалкам на баку тых, хто пратэставаў супраць сфальсіфікаваных вынікаў выбараў і гвалту ў краіне, але быў стрымліваючы фактар, і ў кожнага ён свой.

– Якая зараз сітуацыя на "Беларуськаліі"? Якія настроі ў рабочых?

– Настроі, напэўна, такія, як і ва ўсёй краіне. Ведаю, што многім проста сорамна, што яны не могуць выказаць сваю сапраўдную пазіцыю. Яны баяцца страціць працу, турбуюцца пра бяспеку сваіх сем'яў. Вы ж бачыце, што сёння робіцца ў Беларусі. Калі законаў няма, то пра бяспеку казаць не даводзіцца.

– Можа быць, страйкам у такіх умовах наогул не патрэбны? Эфект ад яго працы, напэўна, практычна такі ж, што і ад незалежнага прафсаюза…

– Сітуацыя вельмі неадназначная. Некалькі замежных кампаній, якія супрацоўнічаюць з "Беларуськаліем", уважліва сочаць за тым, што адбываецца на беларускім прадпрыемстве. І, калі будуць працягвацца парушэнні правоў працоўных на камбінаце, то не выключана нават скасаванне кантрактаў. Для многіх замежных кампаній вельмі важна, каб твой партнёр меў добры імідж. Ад гэтага залежыць і іх імідж.

Таму яшчэ не вядома, у які бок можа сітуацыя павярнуцца. Больш за тое, я шчыра веру, што нельга затушыць той унутраны пратэст, які быў у людзей. Людзям стараюцца вырваць язык, але перакананні не зменіш і рэпрэсіямі любіць не прымусіш. Таму мы таксама будзем сачыць за тым, што будзе адбывацца ў краіне далей.

– Як жывуць тыя работнікі "Беларуськалія", якія далучыліся да страйку і вымушаны былі звольніцца з прадпрыемства? У кожнага, напэўна, сем'і, нейкія фінансавыя абавязкі…

– Ведаю, што ў некаторых звольненых акрамя асноўнага месца працы было і дадатковае. Нехта меў свой невялікі бізнес, а таму без капейкі не застаўся. Хтосьці мае такі запас, які дазваляе пратрымацца без працы не адзін год, частка з'ехала за мяжу

У кожнага свая сітуацыя, і кожны пры звальненні прымаў індывідуальнае рашэнне, сам узважваў усе "за" і "супраць". Ніхто на гэтыя рашэнні ўплываць не мае права.

Дарэчы, пасля таго як генеральны дырэктар "Беларуськалія" Іван Галаваты заявіў, што гатовы прыняць на працу людзей, якія далучыліся да страйку, мы сабраліся, і я сказаў: "Хлопцы, калі вы лічыце, што вам лепш вярнуцца на прадпрыемства, паступайце так, як ведаеце. Ніхто не будзе адгаворваць ці мець нейкія крыўды".

– Асабіста ў вас не было жадання з'ехаць за мяжу з сям'ёй, як гэта зрабіў, напрыклад, кіраўнік страйкама Мінскага трактарнага завода Сяргей Дылеўскі?

– Няма ў мяне такога жадання, таму я сёння не прадаю нерухомасць і не пераафармляю яе на некага іншага.

Хаця, шчыра скажу, сёння ў краіне ціск адчуваюць на сабе ўсе актыўныя людзі. Зараз, калі я выходжу з дома, перш-наперш азіраюся па баках. Раней такога са мной не было. Але даводзіцца жыць і ў такіх умовах…

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ЗАКУЛИСЬЕ

Максим КОНОН:
«Действие лицензии прекращено на три года»

Зять председателя квалификационной комиссии по вопросам адвокатской деятельности остался без лицензии. «Народная Воля» поинтересовалась у Максима Конона, намерен ли он обжаловать решение Минюста.

– *Мне тады так было неспакойна на душы, хацелася хоць нешта зрабіць прыемнае людзям, і вось з'явілася ідэя са сцягам,* – згадвае хлопец.

І да забастоўкі на прадпрыемстве хлопцы не маглі не далучыцца. Андрэй Пагерыла кажа, што ў цэху перад гэтым збіраліся, абмяркоўвалі сітуацыю і нават праводзілі галасаванне, каб страйкаваць, але, калі дайшло да справы, не ўсе работнікі ўзялі ўдзел – паддаліся на запалохванні начальства.

– *Я ніколі не забуду, як падчас жаночых маршаў амапаўцы хапалі дзяўчат за валасы і закідвалі ў аўтобусы,* – згадвае Сяргей. – *Я пасля ўбачанага спаць не мог, выходзіў на ўсе маршы і ніколечкі аб гэтым не шкадую.*

Цяпер абодва хлопцы без працы, шукаюць выпадковыя падпрацоўкі. Кажуць, што родныя і блізкія падтрымліваюць, хаця, канешне, не ўсё так проста. У Андрэя сям'я і двое дзетак.

– *Калі быў на сутках, жонка плакала. Я разумею: ёй было страшна застацца з двума малымі дзецьмі. Зараз крыху супакоілася...*

Але, кажа малады чалавек, прыкрывацца сям'ёй, калі амапаўцы цягаюць за валасы жанчыну ва ўзросце тваёй маці, ён таксама не можа.

Ні Сяргей, ні Андрэй не бачаць сябе на сваім былым прадпрыемстве. Кажуць, што не хочуць больш падтрымліваць гэты рэжым, а вось суд пройдуць да канца, каб паказаць, што закон у краіне важней за нечыя прыхамаці. І нават калі не выйграюць, то многім стане відавочна, якое ў гэтай сістэмы стаўленне да закона.

Абодва дапускаюць, што ў пошуках працы, магчыма, давядзецца з'язджаць за мяжу, бо тут мала што свеціць. Хаця гэты крок непажаданы. Яны хочуць, каб у сваёй краіне быў парадак і нармальна жылося. Чаму ўлады пайшлі на фальсіфікацыю вынікаў выбараў? Чаму супраць мірных пратэстоўцаў былі кінуты ўзброеныя да зубоў амапаўцы?

– *Вось чакаем вясны,* – кажуць хлопцы. – *А там будзе відаць.*

«Гэта як скачок з парашутам»

Аляксей Сідар працаваў машыністам помпавых установак ў цэху "Карбамід-2", мае 5-ы разрад. У яго амаль чатыры гады стажу на "Гродна Азоце".

Гэта ён падчас страйку адмовіўся прымаць змену – на працоўным месцы было няспраўнае абсталяванне, яўна адчувалася загазаванасць, было цяжка дыхаць, рэзала вочы. Папярэдзіў аб гэтым начальства, а яму ў адказ: "Альбо прымаеш змену, альбо валі з завода". А потым выклікалі ахову і вывелі рабочага з тэрыторыі прадпрыемства. Пазней паставілі прагул і звольнілі.

У гэтай справе шмат спецыфічных нюансаў, і ў судзе Аляксей усё дакладна распавядаў, хадайнічаў аб выкліканні сведак, прадстаўленні некаторых дакументаў. Толькі ўсё безвынікова.

– *Але самае прыкрае, што з 28-га ў мяне быў адкрыты бальнічны, а звольнілі мяне таксама гэтым днём, што немагчыма паводле дзеючага заканадаўства,* – канстатуе Аляксей.

Ён кажа, што не чакаў такога ад суда, бо закон быў на яго баку, а таму рыхтуе апеляцыю.

На змене многія яго не падтрымалі: маўляў, што ты робіш, адзін не можа нічога змяніць. Але Аляксей перакананы, што і адзін чалавек на многае здольны – нездарма ж яго пад аховай вывелі з завода.

– *Ну, калі людзям падабаецца душыцца ў тых умовах за тысячу рублёў у месяц, то няхай душацца,* – кажа Сідар.

Праўда, хлопец прызнаецца: было страшна, калі звольнілі. І дадае: у нейкі момант чалавек перастае баяцца.

– *Гэта як скачок з парашутам: ты баішся, баішся, а потым у нейкі момант скачаш – і атрымліваеш задавальненне ад палёту,* – разважае Аляксей. – *А той, хто застаўся, ён і будзе далей баяцца.*

У студзені ў сям'і Аляксея нарадзілася дзіця. Ён увесь у хатніх праблемах, дапамагае жонцы. Кажа, што немаўля вельмі неспакойнае і патрабуе шмат увагі, а таму з пошукам новай працы не спяшаецца.

– *Добра, што раней не патрацілі грошы, якія падарылі на вяселле, ды і частку заробку адкладвалі, цяпер на гэта і жывём,* – кажа хлопец. – *Калі ўжо стане прыцiскаць, то буду шукаць нешта канкрэтнае, але не тут – паеду альбо ў Польшчу, альбо ў Расію.*

Аляксей і яго жонка завочна вучацца, і гэта таксама ўплывае на тое, што проста ўзяць і з'ехаць зараз не могуць.

«Мы жывём у час, калі камусьці закон парушаць можна»

Артура Богуша звольнілі ў той час, калі ён знаходзіўся ў адпачынку, але ў дзень забастоўкі прыйшоў да прахадной прадпрыемства. Ён апаратчык 6-га разраду, працаваў у цэху "Цыклагексанон-2". Не хавае, што ў забастоўцы браў удзел свядома, абсалютна перакананы, што звольнілі яго незаконна. У Працоўным кодэксе чорным па белым запісана, што звальняць работніка, калі ён знаходзіцца ў адпачынку, нельга.

Усё гэта, канешне, прыкра, але, паводле яго слоў, вельмі падбадзёрыла салідарнасць як сяброў, так і людзей, з якімі да гэтага не быў знаёмы.

Артур разам са сваім суседам **Вадзімам Венскім**, якога таксама звольнілі з "Гродна Азота" пасля падзей 26 кастрычніка, спрабуюць наладзіць рамесніцкую справу – заняліся разьбой па дрэве.

Сітуацыя ўскладняецца тым, што Богушу трэба дагледаць старых бацькоў, якія перахварэлі на кавід, мама яшчэ застаецца ў шпіталі.

– *Яны падтрымлівалі мяне, але вельмі хваляваліся.*

Мужчына тлумачыць, што ў страйк ён пайшоў таму, што такіх, як ён, звычайных рабочых збівалі на прахадной і дручкамі заганялі на працу.

– *Гэта непрымальна. І таму пры такой сістэме я не бачу магчымасці працаваць разам з гэтай уладай,* – перакананы Артур.

Міхал КАРНЕВІЧ.

Гродна.

СЛЫШАЛИ?

Анатолий Котов, бывший сотрудник Управделами президента Республики Беларусь, подписал Открытое письмо за отставку Лукашенко и обратился к своим коллегам

Вот фрагмент из обращения А.Котова:

– Как и многие из вас, я прекрасно знаю, что государственная служба – это не об огромных зарплатах, высоком статусе и огромных привилегиях. Это о пользе людям, об ощущении, что ты делаешь что-то важное для них.

Посмотрите на результат своей работы со стороны. Насколько вам комфортно в общественном транспорте, в магазинах слышать то, что вы слышите каждый день в адрес «социального» государства? Но вы можете действительно начать работать ради белорусского народа, ради будущего, в котором не нужно будет стыдиться госслужбы.

Ссылка на видео с полным текстом обращения Анатолия Котова:

https://www.youtube.com/watch?v=KKan3iOw6_w&feature=youtu.be

***

Госслужащие, которым не все равно, совместно с инициативой «Честные люди» и НАУ запустили Открытое письмо сотрудников государственного управления ***(https://telegra.ph/OTKRYTOE-PISMO-01-18)***. Его цель – выразить поддержку народным требованиям о прекращении насилия, проведении честных выборов и отставке Лукашенко.

Открытое письмо сотрудников органов государственного управления Республики Беларусь

Согласно Закону Республики Беларусь **«О государственной службе в Республике Беларусь»** от 14 июня 2003 г. №204-З **государственная служба основывается на принципах:**

– *верховенства Конституции Республики Беларусь;*

– *служения народу Республики Беларусь;*

– *законности;*

– *приоритета прав и свобод человека и гражданина, гарантий их реализации;*

– *гуманизма и социальной справедливости;*

...

– *экономической, социальной и правовой защищенности государственных служащих.*

Мы, нижеподписавшиеся государственные служащие, заявляем, что на сегодняшний день **каждый из этих принципов был нарушен**, и поэтому считаем своим правом и обязанностью выразить протест против насилия над народом Беларуси.

Мы стали свидетелями **фальсификации выборов**, непостижимого **насилия** со стороны силовых структур, а также целенаправленных действий по превращению аппарата государственного управления в **репрессивную машину**.

Данные из подписных листов за кандидатов в президенты не только разглашаются, но и становятся **списками для преследования**. Многочисленные **увольнения** сотрудников в результате **угроз, шантажа, давления** на руководителей, замена компетентных специалистов на «благонадежных» выходцев из силовых структур – все это убеждает нас в том, что мы стоим на пути дальнейшей деградации системы государственного управления Республики Беларусь.

Вышеописанные заявления **подтверждены докладом ОБСЕ** в рамках Московского механизма.

Руководствуясь принципами Закона о государственной службе Республики Беларусь, мы требуем:

1. Прекратить насилие и агрессию в отношении граждан со стороны силовых структур Республики Беларусь, провести надлежащим образом расследование всех фактов причинения телесных повреждений, применения пыток, унижения человеческого достоинства.

2. Освободить политических заключенных, а также всех граждан, задержанных за мирную демонстрацию протеста, квалифицированную действующими властями как противоправная деятельность.

3. Привлечь к ответственности руководителей силовых структур, отдававших преступные приказы, а также исполнителей этих приказов, ответственных за гибель демонстрантов, издевательства над задержанными, угрозы, сокрытие и препятствие официальной регистрации фактов насилия в органах судебно-медицинской экспертизы. Отправить в отставку действующих членов ЦИК с привлечением их к предусмотренной законодательством Республики Беларусь ответственности.

4. Признать официальные итоги выборов Президента Республики Беларусь от 09.08.2020 недействительными в связи с установленными фактами многочисленных фальсификаций **и провести новые выборы Президента Республики Беларусь** в соответствии с международными стандартами.

Государственные служащие выступают вместе с белорусским народом за законность и справедливость! Поэтому мы ***призываем А.Лукашенко добровольно подать в отставку и реализовать мирный сценарий передачи власти*** *в соответствии с Конституцией Республики Беларусь.*

Подписать письмо вы можете через безопасный чат в «Телеграм»: https://t.me/honest_dialog_bot или в **Viber**.

Обратная связь: dialog@honestby.org

АСОБА

Наста КУДАСАВА:

«Я не самотная ў краіне, са мной мой народ – прыгожы, мужны і шчодры»

З-за пандэміі Міжнародны паэтычны фестываль «Вершы на асфальце», які штогод у лютым адбываецца ў Мінску, сёлета праходзіў сціпла, часткова ў анлайн-рэжыме. Але гэта не паўплывала на традыцыйную і галоўную дзею мерапрыемства – уручэнне Літаратурнай прэміі імя Міхася Стральцова. Чацвёртым яе лаўрэатам – пасля Алега Мінкіна, Анхелы Эспіносы Руіс і Анатоля Вярцінскага – стала паэтка з Рагачова Наста КУДАСАВА, з якой мы ў фестывальных кулуарах пагаварылі не толькі пра літаратуру.

– Наста, віншую! Мне здаецца, Міхась Стральцоў на нябёсах задаволены такой лаўрэаткай – прыгожая, таленавітая ды яшчэ зямлячка. У вас, нягледзячы на малады ўзрост, ужо з паўтузіна розных прэмій. Стральцоўскую спадзяваліся атрымаць?

– Дзякуй за віншаванне! Вядома ж, не спадзявалася, для мяне гэта было вельмі прыемнай нечаканасцю і сапраўдным гонарам. Увогуле, я думаю, калі паэт пачынае чакаць прэмій і думаць, што ён іх заслугоўвае, яму можна толькі паспачуваць. Наўрад ці ён працягвае быць шчырым са сваёй музай. Усё ж паэзія – гэта пастаянная рана, якая не мусіць загойвацца, бо, калі табе не баліць па-сапраўднаму, атрымліваюцца так сабе вершы.

– Стральцоўская прэмія мае істотны дадатак – выдаецца новая кніга лаўрэата. У вас назвы кніг заўсёды незвычайныя – "Лісце маіх рук", "Маё невымаўля", і вось цяпер – "Вясна. Веснам цесна". За адну назву ўжо трэба прэміяваць! Іван Мележ назву "Людзі на балоце" цэлы год шукаў. А вы доўга шукаеце?

– Так, звычайна назва выношваецца доўга, разам з кнігай – пакуль чакаеш гэтае дзіця, падбіраеш імёны… У дадзеным жа выпадку шукаць доўга не было магчымасці, бо і кніга стала нечаканасцю. Даваліся арганізавацца хутка. Старшыня Саюза беларускіх пісьменнікаў Барыс Пятровіч прапанаваў мне некалькі варыянтаў з маіх радкоў, і я зразумела, што нічога больш так не хочацца ў гэтыя дні, як вось гэтага жыватворнага пачуцця, калі вясна і веснам цесна… Бо апошні год усіх вельмі змучыў.

– Вось я гартаю вашу новую кнігу і, як жарынкі з вогнішча, выграбаю прыдуманыя вамі словы: *нізкімныя* ночы, ехаць *чалавекаспынам*, у вачах сабакі *невыгаўкны* свет. Вам бракуе слоў у беларускай мове?

– Можна і так сказаць. У нашай мове безліч слоў, але можа быць яшчэ больш. Я ж не ствараю словы-абракадабры, яны ўсе маюць нармальную беларускую структуру. Напрыклад, слова "невыгаўкны" ўтварылася па аналогіі з "невымоўны". Думаю, ніводзін мовазнаўца не зможа мне патлумачыць, чаму такое слова не можа існаваць у нашай мове. Ці тыя ж "нізкімныя ночы". Калі ёсць "нішчымныя", чаму не можа быць "нізкімны"?

– Яшчэ як можа! А калісьці нашы мовазнаўцы складуць слоўнік паэткі Кудасавай. Наста, вам бы ў конкурсах прыгажосці ўдзельнічаць (і там прэміі былі б вашы – я перакананы), а на вашым профілі ў "Фэйсбуку" – чорны авал. Чаму?

– Дзякуй за камплімент, скажаць па шчырасці, я ніколі не адчувала сябе надта прыгожай, усё жыццё прымушаю сябе працаваць над павышэннем самаацэнкі. Чаму замест фота чорны авал? Не ў мяне адной цяпер такі профіль. Я змяніла яго пасля смерці Рамана Бандарэнкі. І пакуль не бачу нагоды змяніць яго на штосьці каляровае. На вялікі жаль.

– Неяк у адным з інтэрв'ю вы саманазваліся іншапланецянкай. І гэта выглядала праўдападобна. Скажыце, падзеі пасля 9 жніўня канчаткова вярнулі вас на зямлю?

– Ведаеце, мая "іншапланетнасць" ніколі не замінала мне бачыць, у якім свеце мы жывём. То-бок я не магу назваць сябе чалавекам, далёкім ад палітыкі. Я ж нават думала паэўны час паступаць на гістарычны факультэт, бо ў школе моцна захаплялася гісторыяй Беларусі і ўжо тады была грамадскай актывісткай. Калі мне было 17, у 2001 годзе, са мной здарылася першая абарона Курапатаў, знаёмства з Паўлам Севярынцам, "Малады фронт". Карацей, я не магу сказаць, што падзеі апошняга часу збілі мяне з ног і сарвалі з вачэй ружовыя акуляры. Я заўсёды ведала, у якой краіне жыву.

– І я ведаў, але той дзікі гвалт, які пачаўся пасля 9 жніўня (і працягваецца да сёння), мяне проста агаломшыў.

– Ну так, ступень гвалту ў жніўні і мяне прымусіла на нейкі час анямець. Бо гэта было жахліва – усвядоміць, наколькі ж гісторыя не вучыць нічому, наколькі лёгка нацкаваць адных людзей на іншых і абудзіць усё самае нізкае і бесчалавечнае ў чалавеку. Гэтага я не чакала. Падалося, што стагоддзі эвалюцыі і культурнага развіцця былі марнымі. Але потым я неяк здолела гэта асэнсаваць. Да таго ж я ўбачыла і станоўчыя змены ў грамадстве. І, дарэчы, цяпер іншапланетнай я сябе ўжо не адчуваю настолькі моцна, як раней. Раней гэта была самота, неактуальнасць, несвоечасовасць. Цяпер жа ўбачыла, што я не такая ўжо і самотная ў гэтай краіне, са мной мой народ – прыгожы, мужны і шчодры.

– У снежні мінулага года вы разам з паэткамі Вальжынай Морт, Юляй Цімафеевай ды іншымі бралі ўдзел у Жаночым паэтычным маршы. Наколькі для вас гэта важна – удзельнічаць у падобных акцыях?

– Цяпер для мяне гэта важна, як ніколі. Спачатку мне здавалася: ну каму сёння патрэбны вершы, калі ў людзей такія праблемы, такі боль?.. А потым я ўбачыла, што мае словы здольны прыносіць іншым палёгку. У апошні час паэзія стала вельмі запатрабаванай, бо менавіта яна можа даваць імгненныя кароткія водгукі на тое, што адбываецца. І людзі такім чынам лечацца ад болю і роспачы.

– Калі я ўспамінаю ваш Рагачоў, то ўвачку паўстае адно відовішча: шырокі Дняпро падмывае берагі разам з магутнымі дрэвамі, і яны падаюць кронамі ў рачную плынь… Беларускую нацыянальную культуру таксама "падмывае", асабліва апошнія паўгода. Упадзём ці выстаім?

– Я ўпэўнена, што выстаім. Чым больш нам даводзіцца перажыць, тым больш чулымі людзі робяцца да свайго. Думаю, неўзабаве нас можа чакаць росквіт нацыянальнай культуры. Адзінае, што не хацелася б святкаваць яго ў падпольных умовах. Хочацца дачакацца таго "залацістага яснага дня", калі мы выйдзем на вуліцы, каб абдымацца, піць шампанскае, спяваць уголас беларускія песні і чытаць беларускія вершы.

– У Стральцова ёсць знакамітае эсэ "Загадка Багдановіча". А для мяне існуе і загадка Кудасавай. Вы скончылі рускую школу ў Рагачове, рускае аддзяленне філфака ў Мінску, паэты ў вас жылі ў Пецярбургу і – сталі выдатнай беларускай паэткай. У вас ёсць гэтаму нейкае рацыянальнае тлумачэнне?

– Я ж у школе чытала не толькі рускую літаратуру, а ўсё, што траплялася на вочы. Была такім апантаным чытачом, што мяне ўсе рагачоўскія бібліятэкаркі ведалі. І ў нейкі момант я проста адчула навакол беларускамоўны свет. Пачала свядома вучыць беларускую мову, выпісваць з кніг незразумелыя словы. Але ж аснова была ўва мне – ад бабулі, ад прабабулі, ад гэтай зямлі. Проста зерне ў патрэбны час упала не на камень.

– Ёсць двухмоўныя і нават трохмоўныя паэты. А вы можаце пісаць вершы не па-беларуску?

– Не магу. Сёння часам нязручна быць беларускамоўным, але гэтыя ўмовы нам штучна навязалі. Можна навязаць іншыя ўмовы, і ўсім будзе зручна быць беларускамоўнымі. Усё павінна быць добра з беларускай мовай, я гэта адчуваю. І ведаю адно – мне трэба пісаць. Паэзія прыходзіць аднекуль, як музыка, і яна гучыць у маёй галаве толькі на беларускай мове.

– І ўсё ж які магніт прыцягнуў вас да беларушчыны?

– Па-першае, я веру ў моцную генетычную сувязь, якая выяўляецца менавіта праз мову, а ўсе мае бліжэйшыя продкі – беларусы. А яшчэ мне заўжды здавалася, што мовы нараджаюцца ў адпаведнасці з краявідам. То-бок менавіта гэтаму краю пасуе менавіта гэтая мова, толькі яна можа дакладна адчуць усе яго каменьчыкі, імхі, рэкі, палі, пагоркі, яго рыб і звяроў. Таму яна не можа не трапіць у само сэрца, гэта як ключ-разгадка да навакольнага свету. Я пражыла на гэтай зямлі большасць свайго жыцця, тут жылі ўсе мае продкі, таму ніякі іншы ключ мне не падыходзіць.

– А кім былі вашы продкі? Адкуль вашы карані?

– Тыя, пра якіх я ведаю, паходзяць з Рагачоўшчыны. І з мамінага, і з татавага боку. Род мой, здаецца, просты, сялянскі. Хочацца неяк знайсці час і магчымасці, каб атрымаць больш звестак пра свае карані. Мяне даўно цягне паглыбіцца ў вывучэнне свайго радаводу.

– Літаратурнай працай сёння беларускі пісьменнік пражыць не можа. Як выжываеце вы? Якім чынам зарабляеце на хлеб надзённы? У вас жа на руках яшчэ і двое непаўналетніх дзетак.

– Я сяджу дома з дзецьмі і займаюся рознымі падпрацоўкамі, часам іранічна называю сябе "дурніцай шырокага профілю". На жаль, сын хварэе на эпілепсію ад нараджэння, таму я не мела шанцаў наладзіць свой працоўны побыт так, як хацелася б. Але, з іншага боку, нішто не даецца дарэмна. Магчыма, менавіта такі жыццёвы рытм дазваляе мне больш пісаць. Я, дарэчы, мару зарабляць на хлеб надзённы літаратурнай творчасцю, каб можна было жыць, хай сабе і бедна. Пакуль што я бачу праблему не ў тым, што ў нас пісьменнікі кепскія ці чытачоў бракуе. З гэтым якраз усё добра. Проста ў Беларусі адсутнічае механізм падтрымкі і прасоўвання літаратуры, а гэта абавязкова мусіць рабіцца на дзяржаўным узроўні.

– Калі вы з раніцы чытаеце апошнія навіны, які настрой пераважае ў вашай душы – злосць, разгубленасць, адчай?

– Цяпер усё часцей адчай і бяссілле. Але гэта толькі з раніцы. Потым цягам дня абавязкова здараецца якая-небудзь цудоўная дробязь, якая вяртае раўнавагу і нагадвае аб тым, што дабра на свеце ўсё ж болей, чым зла.

– Няўмольна набліжаецца сакавік, на беларускіх рэках ужо шэпчуцца крыгі. Чаго вы чакаеце ад вясны – для сябе, для родных вам людзей, для краіны?

– Для сябе я чакаю шчасця і здзяйснення адной вельмі важнай мары. Хоць жыццё, здавалася б, прымусіла не чакаць нічога добрага… Але нават калі задуманае не здзейсніцца, я не буду адчайвацца. А вось для краіны я баюся чагосьці чакаць. Я разумею, што змены да лепшага непазбежныя, сама логіка жыцця іх дыктуе. Але як хутка чакаць тых змен? Тут я не бяруся прагназаваць. Лепш настроіцца на доўгае чаканне, не спадзявацца на імгненны вынік, тады ў нас хопіць сіл дажыць да перамогі.

Міхась СКОБЛА.

З Уладзімірам Някляевым.

Бел-чырвоны букет У.Караткевічу ў Рагачове.

Наста КУДАСАВА

«Мне надае моцы адно – наша любоў»

«Суддзям»

Не марнуюся, не кляну:
вы і ёсць ваша пекла.
І не будзе вам болей сну
ў нашай ціхай і ветлай.
Заставайцеся так, як ёсць,
для жыцця вы чужыя.
Хай калышуць пустую косць
вашы марныя шыі.
Проста ведайце: к вам, людзям
без сумлення і сэрца,
прыйдзе некалі той Суддзя,
што за ўсіх адгукнецца.

***

Мы любілі замкнуцца дома,
каб не чуць выццё Курапатаў.
Мы не верылі ў трыццаць сёмы –
і да нас пагрукаў дваццаты.
Гэта вусціш сапрэлым лісцем
набіваецца ў торбы целаў.
Я б хацела прачнуцца, выйсці,
выплыць, вылецець я б хацела…
Мы не верылі ў трыццаць сёмы,
не глядзелі ў твар Курапатам,
мы, стаіўшыся, спалі дома –
і да нас пагрукаў дваццаты.

***

Знічкай хачу плыць да цябе і не згараць…
Як выжываць сярод людзей? дар мой, дарадзь!
Як уначы, дзе што ні крок – спрэс гадаўё,
ты адшукаў, ты ўратаваў сэрца маё?
Хто той анёл, што ў немаце ёлкай зімы
даў нам займець так наўзаем гэтае "мы"?
Тут, у пустым бомканні злых дзёўбкіх ілбоў,
мне надае моцы адно – наша любоў.

***

Прачынайся, вандроўная, бачыш,
дзе мы захраслі?!
Тут сканалі ад роспачы кафка, оруэл, хакслі.
Тут не ведаюць дна і ўсе разам
лятуць у прадонне.
Тут па міні-армагедоне ў кожным раёне.
Прачынайся, псіхея, вандроўніца!
пойдзем на шпацыр!
Тут любілі маўчаць, таму зараз тут
не дакрычацца.
Так што пойдзем гуляць, загартуем
на вуліцах голас!
Хутка прыйдзе зіма, забінтуе ўсіх нас, загоіць…
Хутка выпадзе снег – такі белы, такі харошы…
Снег мацнейшы і большы за чорных
акрэсцінскіх вошай.
Снег пасцеле нам шлях, і жыццё
распачнецца нанова,
і рассыплюцца турмы, і пасвятлеюць галовы…

Спісы

Восень вечную казань шапоча лістамі чырвонымі,
восень праўду выстуквае дзюбачкай
вернай сініцы...
Але нам не пачуць яе: нас аглушыла імёнамі!
мы вычытваем спісы людскія –
нялюдскія спісы.
Мы чытаем і плачам па знойдзеных
і па не знойдзеных,
у засценках жуды адбываючы год пацучыны…
Там – баранавічы, магілёў, слуцк,
акрэсціна, жодзіна –
гематомы на целе маёй непрытомнай айчыны.
Але некалі скончыцца ўсё, адшалее бязглуздзіца,
адбаліць гэты жнівень, дзе ўсе мы
навек засталіся.
Бог адкрые свой спіс, і тады
аніхто ўжо не згубіцца:
кожны кат, кожны здраднік і вырадак
будзе ў тым спісе.

БЕЗ ГРИФА «СЕКРЕТНО»

Что стало с учеными нацистской Германии после того, как их вывезли в СССР

В мае 1945 года фашистская Германия была разгромлена. Но после нее остался огромный научно-технический потенциал, который интересовал победившие державы, в первую очередь СССР и США. 22 октября 1946 года началась операция по массовому вывозу немецких ученых, инженеров и рабочих в Советский Союз.

Постановление о депортации

В феврале 1945 года в Крыму состоялась встреча Сталина, Рузвельта и Черчилля, на которой в преддверии окончания войны было принято следующее решение: *«Изъять или уничтожить все германское военное оборудование, ликвидировать или взять под контроль всю германскую промышленность, которая могла бы быть использована для военного производства»*.

Постановлением Совета министров от 17 апреля 1946 года советско-германским авиационным ОКБ предписывалось доставить более тысячи немецких специалистов по авиации на специально подготовленные предприятия, расположенные в районе Москвы, Ленинграда, Куйбышева, Казани, Киева, Харькова и других городов.

Общее число депортированных из Германии специалистов и рабочих составляло около 2200 человек. Среди них были инженеры в области ракетной и атомной техники, электроники, оптики, радиотехники, химии. Поскольку вместе с немцами вывозили и их семьи, то общая численность депортируемых должна была составить 6–7 тысяч человек.

Между тем в 1946 году СССР, Францией, Великобританией и США был подписан документ о взаимном контроле над научными исследованиями на территории Германии, согласно которому все военные исследовательские организации предписывалось распустить, а военные сооружения – уничтожить или вывезти. Также были запрещены прикладные научно-исследовательские работы в некоторых областях, в частности в сфере того, что касалось ракетных и пульсирующих двигателей и газовых турбин. Именно поэтому было решено проводить засекреченные работы не на территории Германии, поделенной на оккупационные зоны, а в российской глубинке.

Тайная операция

Руководство операцией было поручено заместителю Берии И.А.Серову. Тот поручил руководителям организаций в Германии подготовить списки наиболее полезных для СССР специалистов, прежде всего конструкторов и ученых. Часть из них находилась в лагерях для военнопленных. Вывозили их в СССР в принудительном порядке, не сообщая об этом заранее, дабы они не попытались сбежать. В акции участвовали 2500 сотрудников управления контрразведки Группы советских оккупационных войск, а также солдаты, занимавшиеся погрузкой имущества.

Ранним утром 22 октября к домам, где жили немцы, которых должны были депортировать, подъехали армейские грузовики. Работники контрразведки зачитывали приказ о депортации, затем людям давали короткое время на сборы, и они садились в поезд – железнодорожные составы специального назначения уже поджидали у вокзалов.

Кроме людей из Германии также доставили опытные образцы самолетов и двигателей, оборудование бывших немецких авиационных ОКБ. Демонтаж этих предприятий и вывоз оборудования продлился до февраля 1947 года.

Жизнь на чужбине

Относительно прибывших немцев была распространена особая директива МВД. Они продолжали считаться подданными Германии, проживая в СССР, имея вид на жительство с отметкой «до особого распоряжения». При этом им не разрешалось покидать территорию населенных пунктов, где располагались их предприятия. Были организованы специальные комендатуры для контроля за режимом.

Некоторые специалисты попали практически в «курортные» условия. Так, в распоряжение немецких физиков предоставили абхазские санатории «Синоп» и «Агудзеры». Первый стали называть «объектом А», второй – «объектом Г». На этих объектах работали выдающиеся ученые: Николаус Риль, который позднее получил звание Героя Социалистического Труда; Макс Фольмер, построивший первую в СССР установку по производству тяжелой воды, а впоследствии возглавивший АН ГДР; Петер Тиссен, который ранее был советником Гитлера по науке; Макс Штейнбек, сконструировавший центрифугу для разделения урана.

Чем же занимались немцы на советских предприятиях? Например, ОКБ-1 построило фронтовой бомбардировщик «150» с крылом обычной стреловидности. ОКБ-2 вело подготовку к испытаниям экспериментального ракетного самолета «Зибель-346». ОКБ-3 занималось созданием автоматической системы управления для крылатых ракет «1БХ».

Лишь в 1950 году части немцев разрешили вернуться назад в Германию. О том, сколько немецких специалистов в конце концов уехало на родину, а сколько так и осталось в СССР, точных данных нет.

КРЫЖАВАНКА

Больш аптымізму!

27 лютага – Дзень аптыміста

Па гарызанталі: 1.“Зямны …, як вядома, круцяць аптымісты” (цытата невядомага аўтара). 2.Бадзёрае і жыццярадаснае светаадчуванне. 6.“Дзяліцеся ўсмешкамі, людзі! Хай … гэты радасней будзе!”. 8.Аўтарытэт (разм.). 10.Кожны … свайго шчасця каваль (прык.). 11.У аптымістаў збываюцца … , а ў песімістаў – кашмары (прык.). 15.Той, хто піша кнігі, стварае музыку. 16.Лепей бы, дачушка, твае … балелі ад пацалункаў, чым вочы ад камп’ютара (прыказка нашага часу). 17. … – спадарожнік аптымістаў (прык.). 20.“Трэба заўсёды ісці наперад, памятаючы, што пасля зімы заўсёды наступае …” (цытата невядомага аўтара). 21.Надпіс на кадры ў кінафільме. 23.Прыстасаванне для транспарціроўкі грузаў. 26.Страва з кавалачкаў мяса ці рыбы. 27.Моцны крык з плачам. 28.Аптымісты хварэюць рэдка; радасць – лепшая ў свеце … (прык.). 29.Для госця і рыбы закон адзін: праз … дні пратухаюць (прык.).

Па вертыкалі: 1.На тое …, каб карась не драмаў (прык.). 3.Кот на … – сцюжа на двор (прык.). 4. … ці імша – каталіцкая абедня. 5.Травяністая расліна з чырвонымі кветкамі. 6. … седакоў – не воз, абы конь вёз (прык.). 7.Тканіна для верхняга адзення. 9. … бачыць абаранак, а песіміст – дзірку ад абаранка (прык.). 12.Збор невялікіх літаратурных ці музыкальных твораў. 13. … стаіць на аднойназе, а праўда – на двух (прык.). 14.Даносчык (праст.). 18.“Песіміст скардзіцца на вецер, аптыміст спдзяваецца на перамену надвор’я, а рэаліст ставіць …” (цытата невядомага аўтара). 19.“Больш аптымізму! Не ператварайце сваё … ў кнігу скаргаў!”. 22.Бяда, калі вушы не чуюць, а … гаворыць (прык.). 23.Лепш дэльфін у руках, чым … у моры (прык.); 19-га лютага – Сусветны дзень кітоў. 24. … бушуе – вясну чуе (прык.). 25.На бязрыб’і і … рыба (прык.).

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Шар. 2.Аптымізм. 6.Свет. 8.Указ. 10.Чалавек. 11.Мары. 15.Аўтар. 16.Губы. 17.Смех. 20.Вясна. 21.Цітр. 23.Канвеер. 26.Рагу. 27.Ёкат. 28.Таблетка. 29.Тры.
Па вертыкалі: 1.Шчупак. 3.Печ. 4.Мша. 5.Мак. 6.Сем. 7.Трыко. 9.Аптыміст. 12.Арабеска. 13.Брахня. 14.Лягавы. 18.Парусы. 19.Жыццё. 22.Рот. 23.Кіт. 24.Вол. 25.Рак.

Лявон ЦЕЛЕШ. г.Дзяржынск.

ГОЛ!

Футбольный календарь – 2021

Чемпионат Беларуси по футболу в этом сезоне стартует 12 марта. Вот расписание всех матчей первенства:

1-й тур (12–14 марта)
Ислочь (Минский район) – Славия (Мозырь)
Сморгонь – Энергетик-БГУ (Минск)
Шахтер (Солигорск) – Минск
Рух (Брест) – Гомель
Спутник (Речица) – Динамо (Брест)
БАТЭ (Борисов) – Слуцк
Неман (Гродно) – Витебск
Динамо (Минск) – Торпедо-БелАЗ (Жодино)

2-й тур (19–21 марта)
Славия – Торпедо-БелАЗ
Витебск – Динамо (Минск)
Слуцк – Неман
Динамо (Брест) – БАТЭ
Гомель – Спутник
Минск – Рух
Энергетик-БГУ – Шахтер
Ислочь – Сморгонь

3-й тур (2–4 апреля)
Сморгонь – Славия
Шахтер – Ислочь
Рух – Энергетик-БГУ
Спутник – Минск
БАТЭ – Гомель
Неман – Динамо (Брест)
Динамо (Минск) – Слуцк
Торпедо-БелАЗ – Витебск

4-й тур (9–11 апреля)
Славия – Витебск
Слуцк – Торпедо-БелАЗ
Динамо (Брест) – Динамо (Минск)
Гомель – Неман
Минск – БАТЭ
Энергетик-БГУ – Спутник
Ислочь – Рух
Сморгонь – Шахтер

5-й тур (16–18 апреля)
Шахтер – БАТЭ
Рух – Сморгонь
Спутник – Ислочь
БАТЭ – Энергетик-БГУ
Неман – Минск
Динамо (Минск) – Гомель
Торпедо-БелАЗ – Динамо (Брест)
Витебск – Слуцк

6-й тур (23–25 апреля)
Славия – Слуцк
Динамо (Брест) – Витебск
Гомель – Торпедо-БелАЗ
Минск – Динамо (Минск)
Энергетик-БГУ – Неман
Ислочь – БАТЭ
Сморгонь – Спутник
Шахтер – Рух

7-й тур (29 апреля – 1 мая)
Рух – Славия
Спутник – Шахтер
БАТЭ – Сморгонь
Неман – Ислочь
Динамо (Минск) – Энергетик-БГУ
Торпедо-БелАЗ – Минск
Витебск – Гомель
Слуцк – Динамо (Брест)

8-й тур (7–9 мая)
Славия – Динамо (Брест)
Гомель – Слуцк
Минск – Витебск
Энергетик-БГУ – Торпедо-БелАЗ
Ислочь – Динамо (Минск)
Сморгонь – Неман
Шахтер – БАТЭ
Рух – Спутник

9-й тур (14–16 мая)
Спутник – Славия
БАТЭ – Рух
Неман – Шахтер
Динамо (Минск) – Сморгонь
Торпедо-БелАЗ – Ислочь
Витебск – Энергетик-БГУ
Слуцк – Минск
Динамо (Брест) – Гомель

10-й тур (19–22 мая)
Славия – Гомель
Минск – Динамо (Брест)
Энергетик-БГУ – Слуцк
Ислочь – Витебск
Сморгонь – Торпедо-БелАЗ
Шахтер – Динамо (Минск)
Рух – Неман
Спутник – БАТЭ

11-й тур (28–30 мая)
БАТЭ – Славия
Неман – Спутник
Динамо (Минск) – Рух
Торпедо-БелАЗ – Шахтер
Витебск – Сморгонь
Слуцк – Ислочь
Динамо (Брест) – Энергетик-БГУ
Гомель – Минск

12-й тур (11–13 июня)
Славия – Минск
Энергетик-БГУ – Гомель
Ислочь – Динамо (Брест)
Сморгонь – Слуцк
Шахтер – Витебск
Рух – Торпедо-БелАЗ
Спутник – Динамо (Минск)
БАТЭ – Неман

13-й тур (17–19 июня)
Неман – Славия
Динамо (Минск) – БАТЭ
Торпедо-БелАЗ – Спутник
Витебск – Рух
Слуцк – Шахтер
Динамо (Брест) – Сморгонь
Гомель – Ислочь
Минск – Энергетик-БГУ

14-й тур (26–28 июня)
Славия – Энергетик-БГУ
Ислочь – Минск
Сморгонь – Гомель
Шахтер – Динамо (Брест)
Рух – Слуцк
Спутник – Витебск
БАТЭ – Торпедо-БелАЗ
Неман – Динамо (Минск)

15-й тур (2–4 июля)
Динамо (Минск) – Славия
Торпедо-БелАЗ – Неман
Витебск – БАТЭ
Слуцк – Спутник
Динамо (Брест) – Рух
Гомель – Шахтер
Минск – Сморгонь
Энергетик-БГУ – Ислочь

16-й тур (16–18 июля)
Славия – Ислочь
Энергетик-БГУ – Сморгонь
Минск – Шахтер
Гомель – Рух
Динамо (Брест) – Спутник
Слуцк – БАТЭ
Витебск – Неман
Торпедо-БелАЗ – Динамо (Минск)

17-й тур (23–25 июля)
Торпедо-БелАЗ – Славия
Динамо (Минск) – Витебск
Неман – Слуцк
БАТЭ – Динамо (Брест)
Спутник – Гомель
Рух – Минск
Шахтер – Энергетик-БГУ
Сморгонь – Ислочь

18-й тур (30 июля – 1 августа)
Славия – Сморгонь
Ислочь – Шахтер
Энергетик-БГУ – Рух
Минск – Спутник
Гомель – БАТЭ
Динамо (Брест) – Неман
Слуцк – Динамо (Минск)
Витебск – Торпедо-БелАЗ

19-й тур (13–15 августа)
Витебск – Славия
Торпедо-БелАЗ – Слуцк
Динамо (Минск) – Динамо (Брест)
Неман – Гомель
БАТЭ – Минск
Спутник – Энергетик-БГУ
Рух – Ислочь
Шахтер – Сморгонь

20-й тур (20–22 августа)
Славия – Шахтер
Сморгонь – Рух
Ислочь – Спутник
Энергетик-БГУ – БАТЭ
Минск – Неман
Гомель – Динамо (Минск)
Динамо (Брест) – Торпедо-БелАЗ
Слуцк – Витебск

21-й тур (27–29 августа)
Слуцк – Славия
Витебск – Динамо (Брест)
Торпедо-БелАЗ – Гомель
Динамо (Минск) – Минск
Неман – Энергетик-БГУ
БАТЭ – Ислочь
Спутник – Сморгонь
Рух – Шахтер

22-й тур (10–12 сентября)
Славия – Рух
Шахтер – Спутник
Сморгонь – БАТЭ
Ислочь – Неман
Энергетик-БГУ – Динамо (Минск)
Минск – Торпедо-БелАЗ
Гомель – Витебск
Динамо (Брест) – Слуцк

23-й тур (17–19 сентября)
Динамо (Брест) – Славия
Слуцк – Гомель
Витебск – Минск
Торпедо-БелАЗ – Энергетик-БГУ
Динамо (Минск) – Ислочь
Неман – Сморгонь
БАТЭ – Шахтер
Спутник – Рух

24-й тур (24–26 сентября)
Славия – Спутник
Рух – БАТЭ
Шахтер – Неман
Сморгонь – Динамо (Минск)
Ислочь – Торпедо-БелАЗ
Энергетик-БГУ – Витебск
Минск – Слуцк
Гомель – Динамо (Брест)

25-й тур (1–3 октября)
Гомель – Славия
Динамо (Брест) – Минск
Слуцк – Энергетик-БГУ
Витебск – Ислочь
Торпедо-БелАЗ – Сморгонь
Динамо (Минск) – Шахтер
Неман – Рух
БАТЭ – Спутник

26-й тур (15–17 октября)
Славия – БАТЭ
Спутник – Неман
Рух – Динамо (Минск)
Шахтер – Торпедо-БелАЗ
Сморгонь – Витебск
Ислочь – Слуцк
Энергетик-БГУ – Динамо (Брест)
Минск – Гомель

27-й тур (22–24 октября)
Минск – Славия
Гомель – Энергетик-БГУ
Динамо (Брест) – Ислочь
Слуцк – Сморгонь
Витебск – Шахтер
Торпедо-БелАЗ – Рух
Динамо (Минск) – Спутник
Неман – БАТЭ

28-й тур (5–7 ноября)
Славия – Неман
БАТЭ – Динамо (Минск)
Спутник – Торпедо-БелАЗ
Рух – Витебск
Шахтер – Слуцк
Сморгонь – Динамо (Брест)
Ислочь – Гомель
Энергетик-БГУ – Минск

29-й тур (20 ноября)
Энергетик-БГУ – Славия
Минск – Ислочь
Гомель – Сморгонь
Динамо (Брест) – Шахтер
Слуцк – Рух
Витебск – Спутник
Торпедо-БелАЗ – БАТЭ
Динамо (Минск) – Неман

30-й тур (28 ноября)
Славия – Динамо (Минск)
Неман – Торпедо-БелАЗ
БАТЭ – Витебск
Спутник – Слуцк
Рух – Динамо (Брест)
Шахтер – Гомель
Сморгонь – Минск
Ислочь – Энергетик-БГУ

Фото: rukh.by

Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 326-68-71
Рэкламны аддзел (017) 363-66-04
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info
Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.
Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ